Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Полацкі дзяржаўны універсітэт
Інстытут гісторыі НАНБ

# ЗБОРНІК НАВУКОВЫХ ПРАЦ

## БЕЛАРУСКІ ГОРАД У ЧАСЕ І ПРАСТОРЫ: 500 ГАДОЎ ПОЛАЦКАЙ МАГДЭБУРГІІ

Репозиторий БарГУ

Наваполацк-Мінск
2001

УДК 947.6 : 316 (082)
ББК 63.3 (4Беи) – 313я431

*Рэдакцыйная калегія*
Г. В. Штыхаў, докт. гіст. навук, прафесар
Э. Р. Іофе, докт. гіст. навук, прафесар
В. І. Шайкоў, канд. гіст. навук, дацэнт

*Рэцэнзенты*
Ул. І. Навіцкі, докт. гіст. навук, прафесар
С. В. Тарасаў, канд. гіст. навук

Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: Зборнік навуковых прац. – Наваполацк: ПДУ, 2001. – 292 с.

ISBN 985-418-093-X

У зборнік уключаны матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі **"Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі."**

Матэрыялы канферэнцыі адлюстроўваюць шырокае кола сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных і духоўна-культурных праблем гарадскога жыцця, раскрываюць рэтраспектыўную ролю і значэнне сістэмы мясцовага самакіравання на Беларусі.

Разлічан на выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў.

ISBN 985-418-093-X

© Калектыў аўтараў, 2001

Репозиторий БарГУ

**Аляксандр Літвінскі**

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ Ў XV-XVIII СТСТ. У АДЛЮСТРАВАННІ ГІСТОРЫЯГРАФІІ ЗАХОДНЕРУСІЗМУ

Адным з найбольш уплывовых накірункаў як грамадска-палітычнай, так і навуковай (у першую чаргу, гістарычнай) думкі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. з'яўляўся так званы заходнерусізм («западнорусизм»). Тэрмін гэты, уведзены ў навуковы абарот вядомым дзеячам беларускага нацыянальнага руху А. Цвікевічам, даволі трапна вызначае сутнасць дадзенай плыні – непрызванне за беларускім этнасам права на самастойнае развіццё, паколькі апошні, на думку «западноруссов», быў, ёсць і будзе толькі кампанентам рускага народа і мае ўсяго толькі тэрытарыяльна-этнаграфічныя асаблівасці[1]. Два фактары, па меркаванню публіцыстаў і гісторыкаў гэтага накірунку, гістарычна забяспечылі непарыўнае адзінства вялікарусаў і беларусаў – агульнасць славянскага паходжання і з'яднанасць праваслаўнай верай. Вось чаму асноўным аб'ектам вывучэння для такіх прадстаўнікоў заходнерусізму, як М. В. Каяловіч (ідэйны лідэр гэтай плыні), П. В. Баброўскі, С. В. Шаўковіч, П. Дз. Брянцаў, П. М. Жуковіч і інш., стала канфесійная гісторыя Беларусі, галоўнай дамінантай якой была, як і сцвярджалі прадстаўнікі дадзенай гістарыяграфічнай школы, перманентная і ўпартая барацьба за ўплыў на Беларусі (як і ў Літве, і на Украіне) арганічна ўласцівага «славянскаму духу» праваслаўя і чужога яму каталіцызма («лацінства» па тэрміналогіі Каяловіча і яго паслядоўнікаў).

Такі падыход быў характэрным і для вывучэння гісторыі гарадоў Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ). Фактычна ігнараваліся пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця, што ж датычыць грамадска-палітычнай і культуралагічнай тэматыкі, то і яе вывучэнне было абмежавана разглядам яе канфесійнага аспекта, які, трэба адзначыць, даследаваўся даволі грунтоўна. Удзел мяшчан у барацьбе супраць царкоўнай уніі 1596 г., дзейнасць царкоўных братстваў, сувязі гарадскога насельніцтва з украінскімі казакамі – вось асноўная «гарадская» праблематыка гісторыяграфіі гэтага накірунку. Пры гэтым падкрэслівалася, што мяшчане ВКЛ аказаліся больш адданымі праваслаўнай веры, чым феадалы.



Репозиторий БарГУ

«Когда пала западнорусская аристократия, – зазначаў М. В Каяловіч, – народное западнорусское дело перешло под защиту среднего сословия – городского, мещанского – и еще более, чем у аристократии, сосредоточилось в вопросе о вере»[2] Адным з фактараў, які абумовіў грамадзянскую актыўнасць мяшчанства, якраз і было Магдэбургскае права[3] М В Каяловіч у цэлым нейтральна ставіўся да яго, паколькі не лічыў, што яно вызначала характар укладу жыцця гараждан, бо ў гарадах пераважала «русское» насельніцтва, для якога была ўласцівая «патрыярхальнасць нораваў»[4] Ён звяртаў увагу на тое, што пры адносна невысокім узроўні развіцця гарадскога жыцця, гарадам і мястэчкам ВКЛ доўгі час удавалася пазбягаць наплыву іншаземцаў, у тым ліку яўрэяў («жидов», по тэрміналогіі Каяловіча)[5]. Акрамя таго, у ВКЛ не склалася, на думку «заходнерусістаў», «тэорыя шляхецтва», нібыта характэрная для Польшчы. Гэта тэорыя падкрэслівала бяспраўнасць большай часткі насельніцтва (сялян і гараджан) у параўнанні са шляхтай, што не спрыяла станаўленню гарадскога саслоўя[6] Па гэтай прычыне насельніцтва гарадоў ВКЛ неаднакроць магло праяўляць сваю грамадзянскую актыўнасць[7] Адпаведна паланізацыя літоўскіх вярхоў у сукупнасці з правам магнатаў валодаць гарадамі і мястэчкамі вяла да занепаду гэтай актыўнасці Асабліва пагоршылася становішча мяшчанства ВКЛ у сувязі з заключэннем міждзяржаўнай Люблінскай уніі 1569 г і Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. Між іншым, адной з прычын апошняй прадстаўнікі гісторыяграфіі заходнерусізму называюць імкненне праваслаўнага епіскапата пазбавіцца ад кантролю за сваей дзейнасцю з боку міран, аб'яднаных у царкоўныя брацтвы[8] Гэтыя арганізацыі, што ўзнікалі амаль ва ўсіх буйных гарадах ВКЛ, звярталі на сябе пільную ўвагу гісторыкаў аналізуемай школы[9]. У іх барацьбе супраць уніі Каяловіч і яго аднадумцы бачылі найярчэйшае праяўленне «западнорусского» духу «літоўскіх» мяшчан і не шкадавалі ўзнеслых эпітэтаў у іх адрас, падкрэсліваючы пры гэтым дэмакратызм брацтваў[10].

Своеасаблівым антыподам праваслаўных брацтваў выступаюць у творах прадстаўнікоў дадзенай плыні гісторыяграфіі іезуіты – найбольш яскравыя выразнікі «духа лацінства»[11] Характарыстыцы іх барацьбы супраць праваслаўя прысвечаны многія старонкі гістарычных работ М В Каяловіча, П Д. Бранцава, П М Жуковіча[12] Гісторыкі дадзенага накірунку падрабязна распавядаюць аб уціску праваслаўных і пратэстантаў з боку трапіўшай пад уплыў Таварыства Ісуса каталіцкай часткі мяшчанства Праваслаўных «исключали из цехов,



Рэпазіторый БарДУ

запрещали заниматься торговлей, даже жить в городах»[13]. Гэтыя акцыі, як паказвае П.М. Жуковіч, фактычна падтрымліваліся цэнтральнай уладай Рэчы Паспалітай, прычым найбольш моцны ўдар быў скіраваны на Віленскае брацтва[14], якое, разам са Львоўскім[15], асабліва вылучалася, на думку «заходнерусістаў», у адстойванні чысціні праваслаўнай веры. Зразумела, сімпатыі гісторыкаў аналізуемага накірунку цалкам на баку брацтваў.

У актыўнай дзейнасці мяшчанства ВКЛ па абароне праваслаўя прадстаўнікі гісторыяграфіі заходнерусізму бачылі пацвярджэнне асноўнага тэзіса не толькі гэтай плыні, але і славянафільства, з нетраў якога і выйшаў заходнерусізм[16] – тэзіса аб карэннай супрацьлегласці «саборнага» праваслаўя і «іерархічнага» каталіцызму[17]. Паколькі уніяцтва, у трактоўцы школы Каяловіча, не з'яўлялася самастойнай канфесіяй, а было толькі галіной «лацінства»[18], то ў дзейнасці уніяцкіх мітрапалітаў, архіепіскапаў, епіскапаў назіралася імкненне сілаю навязаць унію, ніколькі не зважаючы на пазіцыю міран, у т.л. мяшчан ВКЛ (у гэтым і праяўляўся, уласна кажучы, «дух лацінства» з яго ваяўнічасцю, аўтарытарызмам і нецярпімасцю, што пастаянна, нават у гіпертрафіраванай форме, з вялікім дамешкам тэндэнцыйнасці падкрэслівалася славянафіламі ўвогуле і «западноруссами» ў прыватнасці, і гэтым тлумачылася «глыбокая несумяшчальнасць і непрымірымасць лацінства са славянствам»[19]). Зразумела, гісторыкі дадзенага накірунку не маглі абмінуць асобу полацкага уніяцкага архіепіскапа І. Кунцэвіча[20], які апынуўся ў цэнтры драматычных і нават трагічных падзей «бунта» 1623 г. у Віцебску, падчас якога і загінуў. У сваіх курсах лекцый і манаграфіях М. В. Каяловіч, П. Дз. Брянцаў, П. М. Жуковіч прысвяцілі гэтым падзеям нямала старонак[21]. Кунцэвіч характарызуецца на іх як «мучитель православного белорусского народа»[22], фанатык, які не шкадаваў ні сваіх рэлігійных апанентаў, ні сябе. «Кунцевич хотел, во что бы то ни стало добиться мученичества...»[23] – зазначае Каяловіч і гэтым тлумачыць апантанасць полацкага архіепіскапа. Верны супрацоўнік І. Пацея[24], айцец Іясафат яшчэ ў Вільні ўступіў у канфлікт з мясцовым брацтвам і заслужыў сярод праваслаўных дрэнную вядомасць, якая чыніла вялікія перашкоды яго дзейнасці. Гэты тэзіс П. М. Жуковіч ілюструе прыкладам варожых адносін да Кунцэвіча з боку мяшчан Магілёва, якія, атрымаўшы адпаведныя звесткі ад віленскіх братчыкаў, адмовіліся пускаць яго ў свой горад[25]. Не абыйшлі ўвагі прадстаўнікі гісторыяграфіі заходнерусізму і вядомы факт перасцярогі Кунцэвічу з боку Льва Сапегі[26].



Рэпазіторый БарДУ

У апісанні і інтэрпрэтацыі віцебскіх падзей 1623 г. школай Каяловіча можна вылучыць два аспекты. Першы і асноўны – справядлівае па зместу абурэнне віцебскіх мяшчан, выкліканае пастаяннымі правакацыямі Кунцэвіча ў адносінах да праваслаўных.

Негатыўная характарыстыка Кунцэвіча як асобы, яго адданасць справе царкоўнай уніі (што ў вачах «заходнерусістаў» выглядала амаль як злачынства), праца пад кіраўніцтвам аднаго з «айцоў-заснавальнікаў» уніі І. Пацея, канфлікты з брацтвамі (асабліва з віленскімі), а таксама з мяшчанамі сваёй, Полацкай епархіі – усе гэта не магло спарадзіць сімпатыю ў Каяловіча, Бранцава, Жуковіча да ахвяры «бунта» ў Віцебску. Паўстанне, накіраванае супраць уніяцкага архіепіскапа, ў трактоўцы аналізуемай плыні гісторыяграфіі выглядае справай заканамернай і фактычна непазбежнай (тут дарэчы і ўспамін Жуковіча аб лісце Л. Сапегі да І. Кунцэвіча, у якім утрымліваецца папераджальнае біблейскае выслоўе: «мне отмщение, и аз воздам»[27]). Другі аспект, аб якім больш падрабязна будзе сказана ніжэй, – гэта даволі рашучае асуджэнне жорсткасці, праяўленай гараджанамі ў адносінах да ненавіснага ім «пастыра».

Існуюць пэўныя супярэчнасці паміж асобнымі прадстаўнікамі «западнорусской» гісторыяграфіі ў асвятленні пытання аб характары паўстання 1623 г. Калі Каяловіч прытрымліваецца версіі аб патаемнай змове сярод гараджан супраць Кунцэвіча і дадае, што ў гэтай змове ўдзельнічалі ўкраінскія казакі[28] (і з гэтым сцвярджэннем фактычна салідарызуецца Бранцаў, хаця ўпамінае аб гэтым факце мімаходзь[29]), то вучань і спадкаемца Каяловіча на пасадзе прафесара Пецярбургскай Духоўнай Акадэміі Жуковіч з гэтым не згаджаецца і адмаўляе наяўнасць змовы[30] (т.ч., з яго тэзіса выцякае выснова аб стыхійным, хаця і заканамерным характары «бунту»). Сам гэты «бунт» апісваецца даволі падрабязна і амаль натуралістычна[31]. Да гонару прадстаўнікоў славанафільскай плыні гісторыяграфіі гісторыі Беларусі, Літвы і Украіны, яны, нягледзячы на яўную антыпатыю ў адносінах да Кунцэвіча, не ўтойваюць, што яго забойства было здзейснена, кажучы мовай крымінальнага права, «з асаблівай жорсткасцю і цынізмам». Форма расправы з Кунцэвічам рашуча асуджаецца, як і асуджаюцца ўсе такога рода эксцэсы[32]. Забойства характарызуецца як «гнусная справа»[33], «жудасны жорсткі факт»[34], падкрэсліваецца, што яго ўчынілі прышэльцы, а не жыхары Віцебска»[35] (гэтая рамка вынікае з вышэйзгаданай версіі Каяловіча аб змове з казакамі і адпавядае ёй). Не змагло аказаць добратворны ўплыў на паўстанцаў і суцешыць народны гнеў і дзеянне Магдэбургскага

права, якое, на думку старэйшыны заходнерусісцкай гісторыяграфічнай школы, «лучше всех тогдашних средств приучало народ к уважению закона»[36].

Як вядома, паўстанне 1623 г. закончылася жорсткімі рэпрэсіямі супраць яго ўдзельнікаў. Прычынамі такіх суровых санкцый да мяшчан Віцебска з боку урада Рэчы Паспалітай, у прыватнасці, з боку Льва Сапегі, якому М. В. Каяловіч дае высокую ацэнку («найразумнейшы адміністратар таго часу»[37]) і які ўзначальваў следства па «справе бунту», было, як лічыць аўтар, пераканание гэтага дзяржаўнага дзеяча ў тым, «что если оказать теперь малейшее снисхождение православным и бросить тень на унию, то история Кунцевича может повториться в очень многих местах, н, очень вероятно, начнется всеобщая резня униатов, которая неоспоримо получит смысл гражданский и сгубит государство»[38]. Гібель Кунцэвіча, як с жалем адзначае Каяловіч, толькі паспрыяла поспеху царкоўнай уніі, бо гэтаму вельмі садзейнічаў арэол пакутніка, супраць сваёй волі створаны віцебскімі паўстанцамі полацкаму уніяцкаму архіепіскапу[39].

Трагічны зыход падзей 1623 г. у Віцебску, як для Кунцэвіча, так і для праваслаўных гэтага горада, што ўдзельнічалі ў «бунце», спрычыніўся да таго, што роля галоўных змагароў супраць уніі паступова перайшла, на думку прадстаўнікоў аналізуемай плыні, ад мяшчанства Беларусі і Украіны да ўкраінскага, перш-наперш, запарожскага казацтва[40]. Таму пры апісанні падзей сярэдзіны і другой паловы XVII ст., а таксама XVIII ст. яны як быццам губляюць цікавасць да працэсаў, што адбываліся ў гарадах ВКЛ. З'явы грамадска-палітычнага жыцця гарадоў дадзенай тэрыторыі разглядаюцца толькі ў агульным кантэксце развіцця «дзяржавы абодвух народаў» і не вылучаюцца ў самастойны аб'ект даследаванняў[41]. У шмат чым гэта звязана, аднак, не толькі з суб'ектыўнымі прыхільнасцямі гісторыкаў «заходнерусісцкай» школы, але і з аб'ектыўнымі абставінамі гісторыі Рэчы Паспалітай, якія прывялі да істотнай трансфармацыі мяшчанства гарадоў ВКЛ, а таксама і Украіны, землі якой уваходзілі ў склад Кароны. Маецца на ўвазе кардынальнае змяненне этнічнай прыналежнасці насельніцтва гэтых гарадоў у сувязі з масавым прытокам у іх яўрэяў, якія, зразумела, не маглі актыўна падтрымліваць той накірунак грамадска-палітычнай дзейнасці, які быў характэрны для XVI-XVII стст., таму што, у сілу сваёй адданасці іудаізму з'яўляліся маргінальным у прававых адносінах этнасам польска-літоўскай дзяржавы і часта, асабліва ў гады буйных сацыяльных узрушэнняў,



Рэпазіторый БарДУ

адыгрывалі ролю своеасаблівага «сацыяльнага амартызатара». Прыклады жорсткіх распраў над яўрэямі, у першаю чаргу, з боку казакоў прыводзяцца ў творах прадстаўнікоў гісторыяграфіі заходнерусізму[42]. Але варта адзначыць, што духоўны лідэр гэтага накірунку гістарычнай навукі М. В. Каяловіч рэзка адмоўна адносіўся да факта распаўсюджвання яўрэйскага насельніцтва ў гарадах і мястэчках ВКЛ, а таксама Украіны. У віну яўрэям ён ставіў манапалізацыю гандлёва-рамеснай справы, што не давала магчымасці развіцця эканамічным сілам «западнорусского» народа і, як фактар уціску жыццядзейнасці гэтага народа, дапаўняла паланізатарскую палітыку ўладаў Рэчы Паспалітай. У сувязі з гэтым ён даволі ваяўніча заклікаў ачысціць «Западную Россию» ад яўрэйства[43].

Падводзячы вынікі разгляду праблем адлюстравання «заходнерусістскай» гісторыяграфіяй грамадска-палітычнага развіцця беларускіх гарадоў у XV-XVIII стст., неабходна адзначыць, што, па-першае, прадстаўнікі дадзенай плыні гістарычнай навукі не вылучалі мінулае гарадоў Беларусі ў якасці самастойнага аб'екта вывучэння, уключаючы ў значнай большасці выпадкаў іх гісторыю ў агульны кантэкст гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай і разглядаючы яе ў комплексе з гісторыяй гарадоў Украіны (апошняй яны, праўда, удзялялі меншую ўвагу, бо на Украіне дзейнічала значна больш актыўная, чым мяшчанства, палітычная сіла – казацтва). Па-другое, гістарычнае мінулае гарадоў Беларусі вывучалася М. В. Каяловічам, П. Дз. Бранцавым, П. М. Жуковічам амаль выключна з пункту гледжання рэлігійна-канфесійных адносін. Даследаванні сацыяльна-эканамічнага, культурнага жыцця (у той сваёй частцы, якая мала звязана з пытаннямі канфесійнай гісторыі), як правіла, абмяжоўваюцца заўвагамі агульнага характару (напрыклад, ацэнка М. В. Каяловічам Магдэбургскага права). Выключэнне складаюць хіба што работы П. В. Баброўскага[44], але яны, з'яўляючыся па сваёй сутнасці краязнаўчымі[45], маючы мэтай азнаямленне шырокага чытача з мінулым і сучасным аўтару жыццём гарадоў Заходняй Беларусі, не могуць прэтэндаваць на грунтоўнасць і навуковую глыбіню аналізу. Па-трэцяе, у аснову канцэпцыі вывучэння гісторыі беларускіх гарадоў, як, дарэчы, і вывучэння іншых пытанняў, у даследчыкаў дадзенай школы пакладзена філасофія гісторыі славянафільства, для якой характэрна біпалярнасць мыслення: усё праваслаўна-рускае характарызуецца станоўча, усё каталіцка-польскае – адмоўна. Такі падыход яскрава



Рэпазіторый БарДУ

ызначае сімпатыі і антыпатыі навукоўцаў аналізуемай плыні і на-
не ім вельмі выразны адбітак суб'ектывізму, якога, трэба падкрэсліць, не хаваў М. В Каяловіч[46]. Аднак, ужо ў канцы XIX – пачатку XX стст. выклiканая гэтым падыходам тэндэнцыйнасць «заходнерусiсцкай» школы гiсторыяграфii стала аб'ектам навуковай крытыкi з боку прадстаўнікоў расійскай ліберальнай і беларускай нацыянальна-дэмакратычнай гісторыяграфіі[47].

І ўсё ж, нягледзячы на аднабаковасць гісторыяграфічных пабудоў М. В. Каяловіча і яго аднадумцаў, у тым ліку па тэматыцы гісторыі гарадскога жыцця Беларусі – аднабаковасць, якая не давала магчымасці ацаніць усю складанасць і неадназначнасць гэтага жыцця, неабходна адзначыць бясспрэчную іх заслугу ў прыцягненні ўвагі навуковай грамадскасці Расійскай Імперыі да гісторыі Беларусі, Украіны і Літвы. Іншая справа, што гэтая грамадскасць у значнай частцы сваёй не падзяляла іх поглядаў[48], і тэорыя заходнерусізму стала своеасаблівым штуршком, які садзейнічаў, праз з'яўленне канцэптуальна супрацьлеглых навуковых прац, развіццю гістарычнай навукі аб Беларусі і ў Беларусі, якія значна больш падрабязна і на больш высокім метадычна-тэарэтычным узроўні асвятлялі праблемы яе гісторыі, сярод якіх пачэснае месца заняла праблема грамадска-палітычнага развіцця гарадоў Беларусі.

---

Цвікевіч А «Западно-руссизм» – Мн , 1993

Коялович М О Лекции по истории Западной России – М , 1864 – С 262-263

Там же – С 212

4 Там же – С 212-213

Там же – С 212

Там же – С 213

Там же – С 218

8 Жукович П Н Борьба против унии на современных ей литовско-польских сеймах (1595-1600 гг ) – СПб, 1897, Коялович М О Литовская церковная уния Т 1. – СПб, 1859 – С 75

9 Коялович М О О западнорусских церковных братствах //День» – 1861-1862 – № 36-42

10 Он же Литовская церковная уния Т. 1 – С. 65-66, Т 2 – СПб, 1861 – С 83-85

11 Он же Литовская церковная уния Т 2 – С 54

12 Брянцев П. Д История Литовского государства с древнейших времен – Вильно, 1889 – С 370-374, Жукович П Н Кардинал Гозий и польская церковь его времени. – СПб, 1882 – С 402-403, Коялович М О Лекции С 221-230

13 Коялович М О Лекции С 265-266

14 Жукович П Н Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией Вып 1 – СПб, 1901 – С 210-214, 316

15 Там же – С 110, Коялович М О Литовская церковная уния Т. 2 – С. 75

16 Цвікевіч А Цыт твор – С 200-238



Репозиторий БарГУ

[17] Жукович П Н Сеймовая борьба Вып 1 – С 218-221
[18] Брянцев П Д Указ соч – С 396, Коялович М О Литовская церковная уния Т 2 – С 1
[19] Самарин Ю Ф Современный объем Польского вопроса В кн «Отношение к Западной России» / Составил и издал С Шолкович Вып 1 – Вильно, 1885 – С 6
[20] Коялович М О По поводу вновь изданного иезуитом отцом мартыновым сочинения Якова Суши о жизни и подвигах Иосафата Кунцевича //День» – 1865 – № 14
[21] Брянцев П Д Указ соч – С 442, Жукович П Н Сеймовая борьба Вып 4 – СПб 1908 – С 60-104, Коялович М О Лекции – С 266-268, Он же Литовская церковная уния Т 2 – С 128-138
[22] Коялович М О История воссоединения западнорусских униатов старых времен – СПб, 1873 – С 73
[23] Он же Литовская церковная уния Т 2 – С 130
[24] Там же – С 54-79
[25] Жукович П Н Сеймовая борьба Вып 2 СПб, 1904 – С 111
[26] Там же Вып 4 – С 37
[27] Там же
[28] Коялович М О Лекции – С 268
[29] Брянцев П Д Указ соч – С 442
[30] Жукович П Н Сеймовая борьба Вып 4 – С 104
[31] Там же – С 60-104, Коялович М О Литовская церковная уния Т 2. – С 128 138
[32] Жукович П Н Сеймовая борьба Вып 2 – С 110
[33] Коялович М О Литовская церковная уния Т 2 – С 132
[34] Он же Лекции – С 268
[35] Он же Литовская церковная уния Т 2 – С 132-133
[36] Там же – С 131
[37] Там же – С 116
[38] Там же – С 135
[39] Там же – С 136-138
[40] Он же – Лекции – С 269
[41] Он же – История воссоединения
[42] Брянцев П Д Указ соч – С 478-480, Коялович М О Литовская церковная уния Т 2 – С 211
[43] Коялович М О Лекции – С 50-54
[44] Бобровский П О Историко-статистический очерк города Гродно – В кн «Памятная книжка Гродненской губериии на 1860 г » – Гродно, 1860, Он же Исторические сведения о городах Гродненской губернии В кн «Памятная книжка Гродненской губернии на 1861 г » – Гродно, 1861, Он же Г Слоним и примечательные места Слонимского уезда // Вестник Западной России – 1866 – Т 4 – № 12
[45] Нечухрин А Н Историки Западной Беларуси XIX – нач XX вв (очерки) В кн «Наш радавод» Кн 5 Ч 2 – Гродна, 1993 – С 425-428
[46] Коялович М О История русского самосознания – Мн 1997 – С 33-37
[47] Карев Д В Белорусская историография конца XVIII – начала XX вв В кн «Наш радавод» Кн 5 Ч 2 – Гродна, 1993 – С 353-377
[48] Пыпин А Н История русской этнографии – СПб, 1892 – Т 4 Белоруссия и Сибирь С 85 173



Репозиторий БарГУ